# АСАБЛІВАСЦІ ТРАКТОЎКІ ГІСТОРЫІ Ў ПАЭМЕ А. МІЦКЕВІЧА “ПАН ТАДЭВУШ”

***Вежнавец Н. Р.*** *(УА «МДПУ імя І. П. Шамякіна»)*
***Навуковы кіраўнік*** *– П. Р. Кошман, канд. філал. навук, дацэнт*

Паэма “Пан Тадэвуш” была створана А. Міцкевічам у 1832 годзе, у час, калі паэт знаходзіўся ў вымушанай эміграцыі.

Цяжар перажывання адарванасці ад родных мясцін і светлае спадзяванне на вяртанне дадому вызначылі пачуццё настальгіі ў якасці эмацыянальнай афарбоўкі твора, паўплывалі на асаблівасці паэтычнага выяўлення вобраза Бацькаўшчыны, у тым ліку і на трактоўку яе гістарычнага мінулага. Асноўная ўвага А. Міцкевіча была засяроджана на сваёй малой радзіме, Наваградчыне, а час дзеяння аўтар палічыў мэтазгодным дакладна акрэсліць у другой частцы назвы твора “Шляхецкая гісторыя 1811–1812 гадоў”. Аднак каларытныя характары герояў-шляхціцаў, іх сяброўскія і варожыя ўзаемаадносіны, нечаканыя перыпетыі кахання і гісторыя апошняга наезду ў Літве – усё тое, што склала сюжэтную інтрыгу твора ў адзначаны часавы адрэзак, А. Міцкевіч зрабіў залежным ад папярэдніх падзей.

За знешняй бесклапотнасцю шляхецкага жыцця, напоўненага паляўнічымі забавамі і любоўнымі пачуццямі, паэт згодна з рамантычнай эстэтыкай схаваў злачынства, якое ў мінулым унесла разлад паміж шляхецкімі родамі Гарэшкаў і Сапліцаў. Злачынны ўчынак Яцака Сапліцы, які забойствам помсціць за асабістую абразу, з’яўляецца ў паэме прыватнай ілюстрацыяй тых падзей, якія прывялі да краху ўсёй Рэчы Паспалітай. Шляхецкая ганарлівасць, варажнеча, братазабойства – гэтыя адзнакі нядаўняга мінулага сваёй дзяржавы А. Міцкевіч, па сутнасці, лічыў часам нацыянальнай катастрофы і бачыў сваю задачу ў яднанні сваіх суайчыннікаў, у тым ліку і праз адмаўленне ад тых крыўд, што былі ў мінулым. Гэтая аўтарская ідэя прыгожа ўвасоблена ім у вобразах маладой пары Тадэвуша і Зосі, якія ўвасабляюць шчаслівае будучае краю.

Перыяду нацыянальнай трагедыі, звязанай з падзеламі Рэчы Паспалітай, А. Міцкевіч супрацьпаставіў эпоху Вялікага княства Літоўскага як узор моцнай дзяржавы. У паэтычным экскурсе ў даўнюю гісторыю сваёй радзімы менавіта гэты час надзяляецца паэтам адзнакамі так званага “залатога веку”, паўстае ў вобразах славутых літоўскіх князёў – “дзяржаўнага Вітэнаса, вялікага Міндоўга”, легендарнага Гедыміна, заснавальніка сталіцы княства-Вільні, і яго нашчадкаў Кейстута і Альгерда.

Такім чынам, трактоўка гісторыі ў паэме “Пан Тадэвуш” раскрываецца ў кантэксце агульнай ідэйнай скіраванасці твора на крытычнае асэнсаванне падзей апошніх гадоў існавання Рэчы Паспалітай і пошуку ў больш далёкім мінулым вобразаў, вартых для пераймання.

**Літаратура**

1. Міцкевіч, А. Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: Шляхецкая гісторыя 1811 – 1812 гг.: у 12 кн., вершам / А. Міцкевіч. – Мінск: Маст. літ., 1985. – 399 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина